впервые возникает главная тема произведения – тема сахалинского «ада». Образ красной воды, которую пьют сахалинцы, вновь напоминает нам о цветовой символике «ада»: «…жители пользуются из колодцев, в которых во время дождей вода красная, тундровая» [1, с. 211]. Проблематика произведения Чехова, переплетение сюжетных линий, наличие объединяющих образов создают целостное полотно, где основная идея реализуется созданием параллели «ад//рай» и закрепляется антитезой «Сахалин//Родина» (см. рисунок 2). Чехов пишет об этом: «Туманная полоса земли с красивыми горными пиками изо дня в день манит к себе и искушает ссыльного, обещая ему свободу и родину» [1, с. 342]. По мнению автора, Сахалин не может считаться местом нормального существования людей из-за внешних причин (сурового климата, невозможности заниматься сельским хозяйством, плохого материального положения) и внутренних (даже свободный человек по причине близости каторги развращается, становится бесправным существом). Автор подводит читателя к единственной мысли: попавший на адский остров человек не имеет возможности вырваться из него, как из ада. Первые две главы «завязывают» клубок художественных линий, возникает собственно образ острова, встречающего прибывших лесными пожарами, в которых человеку не выжить. Так намечается фабульная рама, замыкающаяся в финале образами больных, умирающих людей (см. рисунок 3). «Остров Сахалин» – жестокая книга, хотя автор нигде не конкретизирует это. Однако уже после возвращения Чехов писал Суворину: «Сахалин представляется мне целым адом» [2, т. 4, с. 342]. А в письме Леонтьеву (Щеглову) мы прочтем следующее: «Я был в аду, каким представляется Сахалин» [2, т. 4, с. 344]. Таким образом, пройдя по всем кругам сахалинского ада, Чехов заканчивает книгу главой о сахалинском лазарете. Глава явно оказывается не на месте, книга обрывается на полуслове. В силах Чехова было композиционно «закруглить» повествование. В книге есть приезд на каторжный остров, но нет отъезда с него. И на последней странице автор так и остается в кругу сахалинских проблем и страданий (см. рисунок 4). Художник с глубоким удовлетворением завершил работу над книгой. 2 января 1894 года он писал: «Медицина не может теперь упрекать меня в измене: я отдал должную дань учености и тому, что старые писатели называли педантством» [2, т. 5, с. 112].







Проведенное исследование позволяет сделать следующие выводы:

1) цикл очерков «Остров Сахалин» представляет собой сложное целое, главной циклообразующей доминантой которого является образ ада, а главной темой – тема сахалинского «ада»;

2) основная идея произведения реализуется созданием параллели «ад//рай» и закрепляется антитезой «Сахалин//Родина»;

3) образная система, цветовая символика, композиция книги – все работает на реализацию главного образа сахалинского ада.

Литература:

1. Чехов, А.П. Полное собрание сочинений и писем: в 30 т. Сочинения: в 18 т. / А.П. Чехов. – Мн.: Наука, 1974 – 1983. – Т. 14 – 15. – 1976. – 855 с.
2. Чехов, А.П. Полное собрание сочинений и писем: в 30 т. Письма: в 12 т. / А.П. Чехов – Мн.: Наука, 1974 – 1983.

## МІФ І ГІСТОРЫЯ Ў РАМАНЕ В. ІПАТАВАЙ «ЗАЛАТАЯ ЖРЫЦА АШВІНАЎ»

Кірушкіна М.І.,
студэнтка 4 курса УА «ГДУ імя Ф. Скарыны», г. Гомель, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Фіцнер Т.А., канд. філал. навук, дацэнт

У дадзеным артыкуле разглядаецца раман В. Іпатавай “Залатая жрыца Ашвінаў” з пункту гледжання суаднесенасці ў творы гістарычнай праўдзівасці і мастацкага вымыслу. Мэта работы – даследаваць міфалагічна-гістарычную мадэль светаадчування беларусаў. У аснове гістарычнай канцэпцыі пісьменніцы – аб’ектыўная дакладнасць пры апісанні мінулага, прыгодніцкі сюжэт, інтрыга і дынаміка ў разгортванні падзей, міфы і культы нашых продкаў.

Выкарыстанне традыцыйных міфалагічных сюжэтаў, рэканструкцыя старажытных міфаў, спалучаная з мастацкім пераасэнсаваннем нацыянальнай гісторыі – адна з вызначальных тэндэнцый сучаснай гістарычнай прозы. Паняцце “міф” паводле В. Руднева [1] валодае такімі значэннямі, як старажытнае паданне, міфатворчасць, асаблівы стан свядомасці, гістарычна і культурна абумоўлены. Міфатворчасць заўсёды служыць дзейсным сродкам асэнсавання не толькі мінулага, але і сучаснага, прадбачання будучага. Дзякуючы звароту да найбольш значных нацыянальных міфаў, таленавіты пісьменнік здольны стварыць новую эстэтычную рэальнасць, у якой прасочваюцца не толькі лёсавызначальныя моманты мінулага, але і ёсць праекцыя на сучаснасць. Прыкладам такога

падыходу да асэнсавання гісторыі і міфа з'яўляецца творчасць К. Вольф. Выклікае цікавасць твор "Касандра", у якім пераасэнсоўваецца нямецкай пісьменніцай Траянскі цыкл міфаў, у прыватнасці, міф аб пакутах грэчаскай прарочыцы, што звязана з мастацкімі развагамі К. Вольф аб мінулым і сучасным нямецкага народа.

А творчасць В. Іпатавай апошніх гадоў вылучаецца рэстаўрацыяй міфалагічных уяўленняў беларусаў, даследаваннем арыйскіх вытокаў у гісторыі славян. У рамане "Залатая жрыца Ашвінаў" пісьменніца звяртаецца да перыяду стварэння беларуска-літоўскай дзяржаўнасці (XIII ст.), калі побач з хрысціянствам існавалі паганскія вераванні нашых продкаў, княжыў вялікі Міндоўг, які "так і застаўся язычнікам са сваім агнём" [2, с. 50]. У тыя часы навагародская зямля была цэнтрам барацьбы, якая вялася паміж прыхільнікамі хрысціянства і язычніцтва, а ўплыў апошняга ішоў ад вераванняў арыйцаў, што прыйшлі ў Еўропу з Азіі. Трэба адзначыць і той факт, што арыйцы – гэта, індаеўрапейцы, якія прыйшлі ў II тыс. да н. э. у Індыю і Іран, а іх архаічная культура і рэлігійныя тэксты (Веды і Авеста) сталі асноўнай крыніцай для рэканструкцыі міфалагічнага свету беларусаў у рамане.

У цэнтры твора – міф пра боскіх блізнятаў Ашвінаў, якія сімвалізавалі жыццё і смерць, святло і цемру, увасаблялі ранішні і вячэрні змрок, лічыліся божымі лекарамі-выратавальнікамі. В. Іпатава лічыць, што "гэты, засыпаны попелам забыцця, культ сонечных братоў-лекараў мае права на ўспамненне" [2, с. 18].

Паняцце свету як універсуму ў рамане ўспрымаецца праз канцэпцыю маральнага дуалізму Зараастры (Заратустры, Заратуштры). У цэнтры яго вучэння – барацьба паміж дзвюма антаганістычнымі сіламі – Дабром і Ліхам. "Гэта ёсць барацьба святла і цемры, жыцця і смерці, цяпла і холаду, праўды і хлусні – усіх антаганізмаў у свеце" [3, с. 142]. Загадкі і таямніцы свету ў творы раскрываюцца з дапамогай амбівалентных быццёвых катэгорый жыццё – смерць, гармонія – хаос, каханне – нянавісць, дабро – зло, прыгажосць – агіднасць. Такое меркаванне мае і вярхоўны жрэц Ашвінаў – Вакула, які лічыць, што "жыццё і смерць сапраўды ходзяць побач" [2, с. 20].

Рэлігійная канцэпцыя Заратустры заснавана на адмаўленні політэізму ў старажытных арыйцаў і на прызнанні монатэістычнасці веравучэння. Прарок верыў у існаванне толькі адзінага Усявышняга Бога, але ў яго рэлігіі заўважнымі былі і прыкметы язычніцтва, якія і ўзнавіла В. Іпатава ў рамане. Вучэнне Заратустры было толькі спробай у распаўсюджанні ідэй новага рэлігійнага канцэпту яшчэ да з'яўлення Хрыста.

Язычніцтва ў рамане "Залатая жрыца Ашвінаў" – гэта нацыянальны міф, гэта новы аспект рэлігійнага адкрыцця, звернуты да беларускага народа, гэта асэнсаванне духоўнай, трансфізічнай рэальнасці, што яшчэ ў глыбокай старажытнасці праявілася ў беларускай гісторыі і свядомасці нашых продкаў, і па сутнасці, не зжыта і сёння.

На падставе сказанага вышэй можна сцвярджаць, што В. Іпатава працуе ў новым мастацкім рэчышчы асэнсавання мінулага, дзе ўзнаўляюцца вядомыя гістарычныя постаці, суіснуюць побач розныя рэлігійныя ўяўленні, міфічна-гістарычнае мадэляванне вобразаў язычніцкіх багоў, культы арыйцаў і духоўных канцэптаў Заратустры. А гэта, на наш погляд, перспектыўны шлях развіцця гістарычнай прозы на сучасным этапе.

Літаратура :


1. Руднев, В. Словарь культуры XX века / В. Руднев. – М.: Аграф, 1997. – С. 169 – 172.
2. Іпатава, В. Залатая жрыца Ашвінаў / В. Іпатава // Полымя. – 1997. – № 10. – С. 16 – 110.
3. Шамякіна, Т. Рэлігія і мастацтва Ірана (Персіі) / Т. Шамякіна // Роднае слова. – 1997. – № 9. – С. 139 – 153.


## АДМЕТНАСЦІ МАСТАЦКАГА ПСІХАЛАГІЗМУ Ў ФІЛАСОФСКА-АЛЕГАРЫЧНЫХ АПАВЯДАННЯХ ВАСІЛЯ БЫКАВА


Клеменціёнак А.А.,
студэнт 3 курса УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Падстаўленка В.Ф., канд. філал. навук, дацэнт


**Уводзіны.** Мэта: прааналізаваць спецыфіку выяўлення мастацкага псіхалагізму ў філасофска-алегарычных апавяданнях В.Быкава. Асноўныя метады: структурна-аналітычны, параўнальна-супастаўляльны.

**Асноўная частка.** У сваіх апошніх творах Васіль Быкаў імкнуўся глыбока прааналізаваць навакольную рэчаіснасць, высветліць прычыны з'яўлення і пашырэння маральнай недасканаласці ў чалавечым грамадстве. Таму аўтар выкарыстоўваў спецыфічныя алегарычныя вобразы ў творах, з дапамогай якіх даносіў чытачу вынікі сваіх назіранняў за рэчаіснасцю. Дадзеныя мастацкія сродкі дазвалялі па-філасофску значна раскрыць сутнасць грамадства, паказаць яго ў развіцці, больш моцна ўздзейнічаць на свядомасць чытача.